# АБВЯШЧЭННІ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ БЕЛАРУСІ

**У 20-м стагоддзі ў БЕЛАРУСІ было ШЭСЦЬ абвяшчэнняў незалежнасці краіны.**

**Першае абвяшчэнне было 25 сакавіка 1918 года пашыраным складам Рады Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). У галасаванні, якое праходзіла ва ўмовах нямецкай акупацыі, прынялі ўдзел 77 чалавек, з іх 36 сяброў Рады 1-га Усебеларускага з'езда, які праходзіў 5-18 снежня 1917 года. У працы 1-га Ўсебеларускага з'езда прымалі ўдзел 1872 дэлегаты з усіх рэгіёнаў Беларусі (1167 - з правам рашаючага голасу і 705 – з правам дарадчага голасу). З'езд быў разагнаны бальшавікамі 18 снежня 1917 года.**

**Другое абвяшчэнне, Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь (ССРБ), сталася 1 студзеня 1919 года на канферэнцыі Паўночна-заходняй вобласці Расійскай камуністычнай партыі (бальшавікоў) ў Смаленску (канферэнцыя пераіменавана ў 1-ы з'езд Камуністычнай партыі Беларусі). У канферэнцыі удзельнічаў 181 дэлегат ад камуністычных арганізацый. Першы з'езд Саветаў Беларусі (2-3 лютага 1919 года) адобрыў утварэньне БССР і гэты ж з'езд прыняў пастанову аб аб'яднаньні з Літвой. На з'ездзе прысутнічалі 230 дэлегатаў - 213 камуністаў і 17 спачуваючых (Мінская губерня - 121, Гродзенская - 11, Магілёўская - 10, Віленская - 25, Смаленская - 49, Віцебская - 0).**

**Трэцяе абвяшчэнне адбылося 27 лютага 1919 года пры ўтварэнні ЛітБел(а) - Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў адпаведнасці з рэкамендацыямі ЦК РКП(б). ЛітБелССР праіснавала да жніўня 1919 г., калі яе тэрыторыя была захоплена польскімі войскамі ў часе польска-савецкай вайны (студзень 1919— сакавік 1921).**

**Да ведама: ЗМЕНЫ ЎЛАДЫ Ў ГОРАДЗЕ МІНСКУ Ў 20-М СТАГОДДЗІ**

**У другой палове верасня 1917 г. у ходзе перавыбараў Саветаў бальшавікі атрымалі большасць у Мінскім Савеце рабочых і салдацкіх дэпутатаў і ўзялі ўладу ў свае рукі. 21 лютага 1918 года горад занялі германскія войскі. 10 снежня 1918 года вярнуліся бальшавікі. 8 жніўня 1919 года горад заняла польская армія. 11 ліпеня 1920 года палякі пакінулі горад, вярнуліся бальшавікі. 26 чэрвеня 1941 года горад заняла нямецкая армія. 3 ліпеня 1944 года Чырвоная Армія вызваліла горад ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

# АБВЯШЧЭННІ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ БЕЛАРУСІ *(працяг)*

**У 20-м стагоддзі ў БЕЛАРУСІ было ШЭСЦЬ абвяшчэнняў незалежнасці краіны.**



**1920-1924**



**1927-1937**



**1937-1951**

**Чацвёртае абвяшчэнне было 31 ліпеня 1920 года на сходзе прадстаўнікоў Кампартыі Літвы і Беларусі, савецкіх і прафсаюзных арганізацый Мінска і Мінскай губерні - была прынята *Дэкларацыя аб незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь* (ССРБ) - дзяржаўны і палітычны акт аб аднаўленні Беларускай ССР на асновах, вызначаных у Маніфесце Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі 1 студзеня 1919 г. (гл. другое абвяшчэнне). Паводле Дэкларацыі да склікання з’езда Саветаў БССР уся ўлада ў рэспубліцы перадавалася Ваенна-рэвалюцыйнаму камітэту БССР. Другі з'езд Саветаў, які зацвердзіў гэту Дэкларацыю, адбыўся 13-17 снежня 1920 года. Прысутнічала 218 дэлегатаў, за невялікім выключэннем - камуністы. Па нацыянальнаму складу беларусаў было - 111, рускіх - 42, яўрэяў - 36, палякаў - 8, іншых нацыянальнасцяў - 21.**

**з 30 снежня 1922 г. БССР у складзе СССР**



**Пятае абвяшчэнне было зроблена 27 чэрвеня 1944 года на 2-м Ўсебеларускім кангрэсе, які прызначыў Беларускую Цэнтральную Раду (БЦР) на чале з Р. Астроўскім пераемніцай Рады БНР. На з'ездзе прысутнічалі 1030 дэлегатаў з розных рэгіёнаў Беларусі. Кангрэс праходзіў ва ўмовах нямецкай акупацыі.**


**1951-1991**


**1991-1995**


**1995-2015**

**Шостае абвяшчэнне адбылося 27 ліпеня 1990 года. Вярхоўны Савет БССР прыняў у гэты дзень Дэкларацыю аб суверэнітэце Беларусі. Тамчасны Вярхоўны Савет 12-га склікання налічваў 346 абраных дэпутатаў, з іх 50 дэпутатаў былі непасрэдна вылучаны грамадскімі арганізацыямі. 25 жніўня 1991 года Дэкларацыі быў нададзены статус Закона.**